

«НІВА» ПАЧЫНАЛАСЯ... ПАД ЛЁЗНАМ

«ДЖЭНТЛЬМЕНСКІ СПОРТ» НА КАЛЯСКАХ 15





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

6 ЖНІЎНЯ 2019 г. АЎТОРАК № 146 (29013)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Станіслаў САЛАВЕЙ, старшы інспектар па асаблівых даручэннях УДАІ Міністэрства ўнутраных спраў:**

*«Падрыхтаваны змены ў заканадаўстве, якія будуць рэгламентаваць правілы карыстання электрасамакатамі, яны набудуць сілу ў найбліжэйшы час. Электрасамакат можа развіваць хуткасць да 25 км/г, а часам значна больш. Плануецца, што карыстальнікі прылад, якія развіваюць хуткасць да 25 кіламетраў у гадзіну, будуць прыраўноўвацца да пешаходаў. Больш магутныя прылады з электрарухавікамі ўжо будуць прыраўноўвацца да мапедаў альбо матацыклаў, на якія трэба будзе мець пасведчанне кіроўцы і страхоўку, праходзіць тэхагляд».*

# МАЯ РАДАСЦЬ ТЫ, ЛЯНОК!



Фота БелТА.

**Сярод шэрагу рэгіянальных фестываляў свята «Льняная карусель», якое ў мінулую пятніцу прайшло ў гарадскім пасёлку Карма, несумненна, зойме годнае месца — яно прапагандуе адзін з сімвалаў Беларусі: кветкі льну, змешчаныя нават на дзяржаўным гербе. Тым больш што арганізатары фестывалю пастараліся здзівіць і ўразіць гасцей. Як вам, напрыклад, гэта льняная жар-птушка, побач з якой ахвотна фатаграфуецца юная ўдзельніца фестывалю Ульяна КАРАТКЕВІЧ?**

## КОРАТКА

- **Сярэдні памер пенсіі па ўзросце пасля пераразліку ў жніўні склаў Br446,84.**
- ПВТ запрашае настаўнікаў на абноўлены анлайн-курс «Scratch 3.0 для пачаткоўцаў».
- **Зборнік дакументаў аб удзеле партызан у аперацыі «Баграціён» прэзентуюць у Мінску.**
- У Беларусі затраты на аказанне ЖКП у студзені—чэрвені 2019 года знізіліся ў параўнанні з аналагічным перыядам 2018 года на 5,8 % пры заданні 5 %.
- **У Мінскім заапарку зубрыца Мулатка нарадзіла зубранят-двайнят.**



Тэхналогіі плюс

## Лечаць ствалавымі клеткамі, друкуюць каронкі і масты




Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**Як беларускія стаматолагі выкарыстоўваюць клетачныя тэхналогіі, у прыватнасці лечаць ствалавымі клеткамі апусканне дзясны? Навошта кожнаму наведваць стаматолага раз на паўгода і чаму чысціць зубы варта пастай з фторам? Адбельванне зубоў і вініры — усяго толькі даніна модзе ці медыцынская неабходнасць? Увогуле якія кірункі эстэтычнай стаматалогіі сёння ў трэндзе, а таксама хто і чаму едзе ў Беларусь лячыць зубы? Пра гэта і іншае расказалі спецыялісты падчас наведвання журналістамі Рэспубліканскай клінічнай стаматалагічнай паліклінікі.**

СТАР. 4

Малая радзіма

## КОЛЬКІ КАШТУЕ ПАМЯЦЬ?

### Як бабруйчане ратуюць нават безнадзейныя помнікі архітэктуры і захоўваюць памяць аб тых, кім ганарацца

**Іх і помнікамі нават не назавеш, няма ў іх такога статусу. Так, кавалачкі гісторыі ў выглядзе паўразбураных сцен, падмуркаў. З імі звязаны мясцовыя тапонімы, легенды, вядомыя імёны, але сродкаў на гэта не прадугледжана. А значыць, верагоднасць таго, што іх убачаць нашы нашчадкі, вельмі нязначная. Калі толькі мы самі гэтага не пажадаем.**

Адразу ж згадаўся пасёлак Глуша Бабруйскага раёна, дзе намаганнямі бабруйчаніна Андрэя Архіпенкі з'явілася і яшчэ з'явіцца шмат знакавых месцаў, звязаных з імем беларускага пісьменніка Алеся Адамовіча. Тут ужо ёсць адамовіцкі арт-прыпынак, у працэсе выраб помніка і спецыяльных вулічных паказальнікаў, у больш далёкіх планах — захаваць гістарычны будынак, дзе пэўны час жыў класік і дзе адбываліся падзеі яго дылогіі «Вайна пад стрэхамі» і «Сыны ідуць у бой». Андрэй упарты, і гэта дапамагае яму знаходзіць аднадумцаў і рэалізоўваць намечанае. Таму і будынак яшчэ не ідзе пад знос.

СТАР. 13

ISSN 1990 - 763X

# ДЫНАМІЧНЫ СТАРТ

## Прэзідэнт сустрэўся з прадстаўніком Еўрапейскага інвестыцыйнага банка

**На сустрэчы з віцэ-прэзідэнтам ЕІБ Вазілам Худакам кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка найперш падзякаваў госцю за плённае супрацоўніцтва. «Я проста па-чалавечы павінен вам падзякаваць за тое супрацоўніцтва, якое ў нас з вамі ўстанавілася. Магу запэўніць, што інтэнсіўнасць гэтага супрацоўніцтва, той узровень, на які мы выйшлі, — беспрэцэдэнтныя, — заўважыў беларускі лідар. — Пры гэтым праекты ў нас вельмі сур'ёзныя. Дзякуй і іншым банкам, якія з'яўляюцца суінвестарамі па гэтых праектах».**

Аляксандр Лукашэнка пералічыў шэраг важных для нашай краіны кірункаў, па якіх Еўрапейскі інвестыцыйны банк ажыццяўляе крэдытаванне. Сярод іх рэканструкцыя дарогі М-7/Е28 Мінск — Ашмяны — граніца Літоўскай Рэспублікі (Каменны Лог), у тым ліку рэканструкцыя самога прапускнога пункта на граніцы. «Мы разумеем, што для Еўропы, Расіі, Кітая гэта тысячакіламетровае акно праз Беларусь надзвычай важнае, — сказаў Прэзідэнт. — І тое, што мы цяпер з вамі робім, — гэта не толькі для Беларусі або нейкай адной краіны. Гэта для ўсяго свету найважнейшыя артэрыі».

Разам з Еўрапейскім банкам рэканструкцыі і развіцця ЕІБ фінансуе рэканструкцыю Мінскай ачышчальнай станцыі. У выніку ў 24 разы будзе знізаны аб'ём вывазу і захавання асадку сточных вод, знізіцца газавыя выкіды і забруджванне Свіслачы, а значыць, больш чыстыя стануць Днепр і Чорнае мора. «Вы вельмі моцна дапамагаеце нам у пытаннях аховы навакольнага асяроддзя, — сказаў Аляксандр Лукашэнка віцэ-прэзідэнту ЕІБ. — Я — чалавек ад прыроды, чалавек вясковы, таму для мяне гэта найважнейшы аспект».

Яшчэ адзін значны праект, які цяпер ажыццяўляецца ў Беларусі сумесна з Еўрапейскім інвестыцыйным банкам, накіраваны на павышэнне эфектыўнасці і якасці камунальных паслуг. Размова ідзе пра рэканструкцыю і будаўніцтва аб'ектаў водазабеспячэння і водаадвядзення.

Асабліва важным Прэзідэнт назваў супрацоўніцтва, якое прадугледжвае фінансаванне банкам Еўрасаюза будаўніцтва і рэканструкцыі ў нашай краіне кацельных прадпрыемстваў жыллёва-камунальнай гаспадаркі з забеспячэннем выкарыстання на іх драўнянага паліва. «У нас лесу вялізная колькасць — 40 працэнтаў тэрыторыі, дроў хапае, а мы для ацяплення выкарыстоўваем часцей за ўсё прыродны газ, недзе яшчэ і нафтапрадукты. Гэта ненармальна», — пракаментаваў сітуацыю Аляксандр Лукашэнка.

«Спадзяюся, што наша супрацоўніцтва будзе развівацца такімі ж тэмпамі, мы знойдзем новыя кірункі, якія будуць выгадныя для вас і для Беларусі. Я гатовы быць гарантам, як і для іншых замежных банкаў. Мы заўсёды былі надзейным партнёрам і выконвалі свае абяцанні. Словам, будзем працаваць, і вы гэта ўбачыце», — рэзюмаваў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Вазіл Худак адказаў, што плённае супрацоўніцтва банка з Беларуссю абумоўлена тым, што наша краіна дынамічна развіваецца і мае вельмі цікавыя магчымасці для ўкладання інвестыцый. «Інвестыцыі банка маюць доўгі прамежак — на 15—25 гадоў. Такія доўгія інвестыцыі можна ўкладаць толькі ў тыя краіны, дзе ёсць устойлівае развіццё, дзе ёсць аптымізм інвестараў у тым, што краіна сапраўды будзе развівацца, што краіна стабільная. Гэта вельмі важна ў сённяшнім свеце, які поўны розных пагроз. Хацеў бы і вам падзякаваць за тое, што ў такім кірунку краіну ведзяце», — сказаў віцэ-прэзідэнт Еўрапейскага інвестыцыйнага банка.

Пазней для журналістаў ён дадаў: «У нас была вельмі добрая сустрэча з Прэзідэнтам — дзелавая і ў той жа час па-чалавечы цёплая. Сапраўды, Еўрапейскі інвестыцыйны банк вельмі актыўна развівае сваю дзейнасць у Беларусі. За апошнія паўтара года мы ўжо выдзелілі крэдытаў на 350 мільёнаў еўра. Да канца года павінны выйсці на паўмільярда. Такое дынамічнае развіццё звязана як мінімум з дзвюма рэчамі. Па-першае, Беларусь з'яўляецца стабільнай краінай і ў палітычным, і ў эканамічным плане, што для інвестараў — гарантыя вяртання сродкаў і надзейнага іх укладання. Па-другое, Беларусь з'яўляецца ключавой дзяржавай для Еўрасаюза з пункту гледжання Усходняга партнёрства і развіцця еўрапейскіх інтарэсаў у гэтай прасторы. Роля Беларусі ў злучэнні Азіі і Еўропы для нас вельмі важная.

Датычна прапановы міністэрства эканомікі Беларусі па адкрыццю прадстаўніцтва ЕІБ у нашай краіне Вазіл Худак сказаў: «Мы ўдзячныя за такую прапанову. Адкрыццё прадстаўніцтва — нялёгкае рашэнне, мы не маем іх у кожнай краіне, дзе працуем. Таму пра гэта трэба падумаць. Але калі глядзець наперад, думаю, мы будзем штогод інвеставаць мінімум 200—300 мільёнаў еўра, таму гэта пытанне сапраўды перспектыўнае».

Прадстаўнік Еўрапейскага інвестыцыйнага банка таксама пацвердзіў, што да канца года каля 80 мільёнаў еўра будзе выдзелена на крэдытаванне малога і сярэдняга бізнесу ў Беларусі. «Мы бачым гэты кірунак як вельмі перспектыўны і ўжо на вопыце тых крэдытаў, якія былі выдзелены праз асноўныя банкі Беларусі, упэўніліся, што попыт на гэтыя грошы вялікі, так што будзем працягваць».

Неабходнае для пачатку ажыццяўлення дзейнасці ЕІБ у Беларусі Рамачнае пагадненне паміж банкам і нашай дзяржавай было падпісана ў ліпені 2017 года.

«ЕІБ афіцыйна не публікуе звестак аб коште фінансавання. Тым не менш для суверэнных пазык кошт запазычання нават меншы за кошт рызык МБРР (Міжнароднага банка рэканструкцыі і развіцця. — **«Зв.»**). У рамках першага падпісанага ў Беларусі Дагавора аб фінансаванні ў 2018 годзе па праекце «Рэканструкцыя Мінскай ачышчальнай станцыі» стаўка фарміравалася на падставе EURIBOR (Еўрапейскай міжбанкаўскай стаўкі прапановы. — **«Зв.»**) плюс фіксаваны спрэд у памеры 0,596 %, пры гэтым агульны тэрмін пагашэння склаў 31 год», — праінфармаваў міністр эканомікі Рэспублікі Беларусь Дзмітрый Крутой.

Цяпер сумесна з экспертамі ЕІБ прапрацоўваецца магчымасць рэалізацыі наступных інвестыцыйных праектаў, такіх як: электрыфікацыя чыгуначных участкаў Баранавічы — Лунінец — Сітніца і Калінкавічы — Сітніца коштам каля 100 мільёнаў еўра; тэхнічная дапамога Міністэрству транспарту і камунікацый для распрацоўкі абгрунтавання інвестыцый у стварэнне адзінай сістэмы аплаты праезду за кошт сродкаў Траставага фонду тэхнічнай падтрымкі Усходняга партнёрства; павышэнне энергаэфектыўнасці аб'ектаў аховы здароўя і сацыяльнай сферы; рэканструкцыя шэрагу энергетычных падстанцый; мадэрнізацыя Гомельскай ТЭЦ-2 і іншыя.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## СУСТРЭЧА З КІРАЎНІКОМ АПЕРАТЫЎНА-АНАЛІТЫЧНАГА ЦЭНТРА

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка правёў сустрэчу з начальнікам Аператыўна-аналітычнага цэнтра Андрэем Паўлючэнкам. Аб гэтым паведамляе БелТА са спасылкай на прэс-службу беларускага лідара.**

Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся вынікамі выканання дадзеных раней даручэнняў па развіцці гэтай структуры. Абмеркаваны таксама асноўныя кірункі работы ААЦ, актуальная тэматыка, што знаходзіцца ў полі зроку цэнтра, кадравыя пытанні. Андрэй Паўлючэнка далажыў аб суправаджэнні цэнтрам рэзанансных крымінальных спраў, а таксама шэрага вялікіх інфраструктурных праектаў.

## У тэрмін, вызначаны Канстытуцыяй

### Выбары Прэзідэнта Беларусі могуць адбыцца 30 жніўня 2020 года

**Старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія ЯРМОШЫНА назвала магчымую дату выбараў Прэзідэнта краіны. Гаворачы пра аптымальны час правядзення выбараў кіраўніка дзяржавы, старшыня ЦВК адзначыла, што гэта — ранняя вясна.**

«Але ў нас толькі выбары пройдуць у лістападзе, а ў снежні мы сфарміруем парламент, — канстатавала яна. — Таму праз тры месяцы трэба адразу назначаць прэзідэнцкія выбары. А для чаго мы тады пераносілі гэтыя?»

«Прэзідэнцкая кампанія, хутчэй за ўсё, пройдзе ў той тэрмін, які вызначаны Канстытуцыяй. Апошняя магчымая нядзеля — 30 жніўня 2020 года. Думаю, што гэта з вялікай імавернасцю і ёсць дата выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь», — сказала Лідзія Ярмошына. Паводле яе слоў, з аднаго боку, яшчэ будзе лета, але з іншага, 30 жніўня — час, калі большасць грамадзян вяртаецца з водпуску, з'язджаюцца студэнты. Таму насельніцтва большай часткай будзе знаходзіцца па месцы сваёй рэгістрацыі. «Але гэта пакуль толькі меркаванне», — заўважыла кіраўнік Цэнтрвыбаркама.

Як паведамлялася, у Пасланні беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу Аляксандр Лукашэнка заявіў, што ў 2019 годзе ў Беларусі адбудуцца выбары ў Палату прадстаўнікоў і Савет Рэспублікі. Прэзідэнцкія выбары ў Беларусі, як і планавалася, пройдуць у 2020 годзе.

**Паводле БелТА.**

Супрацоўніцтва

## Маладзёжны ІТ-форум Беларусі і Узбекістана

**Яго арганізатарам выступае Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі. Мерапрыемствы будуць доўжыцца да 9 жніўня.**

Форум заклікаены стаць пляцоўкай для абмеркавання сучасных трэндаў і выклікаў у ІТ, ключавых момантаў работы ў гэтай сферы, перспектыў развіцця міжнароднага маладзёжнага стартап-руху і прадпрымальніцтва.

Дэлегацыя ўдзельнікаў форуму ад Саюза моладзі Узбекістана ў колькасці 30 чалавек прыбыла ў Беларусь 5 жніўня. Узбекскую маладзёжную дэлегацыю ўзначаліў першы намеснік дарадчыка Прэзідэнта па пытаннях моладзі, навукі, адукацыі, аховы здароўя і спорту — старшыня Цэнтральнага савета Саюза моладзі Узбекістана (СМУ) Кахрамон Куранбаеў.

Праграма маладзёжнага адукацыйнага праекта насычана рознымі відамі дзелавой і культурнай актыўнасці. Яна ўключае чатыры сесіі з удзелам вядучых экспертаў у ІТ-вобласці, прэзентацыі, якія пройдуць на базе БДУІР, БНТУ, Навукова-тэхналагічнага парка БНТУ «Палітэхнік», Мінскага гарадскога тэхнапарка, адукацыйнага цэнтра ПВТ і ЕРАМ Systems і аб'ядноўваюць прасунутых у сферы інфармацыйных тэхналогій маладых людзей абедзвюх краін. Культурны складнік праграмы для гасцей з Узбекістана дапоўняць экскурсіі па Мінску: у кампанію Wargaming, Нацыянальную бібліятэку Беларусі, Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Нагадаем, у снежні мінулага года БРСМ і СМУ падпісалі мемарандум аб супрацоўніцтве. Першым крокам у рэалізацыі дарожнай карты супрацоўніцтва стала арганізацыя работы зводнага студэнцкага беларуска-ўзбекскага будаўнічага атрада, сфарміраванага са студэнтаў Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта і Ташкенцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Не менш за 17 чалавек загінула пры выбуху ў Каіры

У выніку ДТЗ у Каіры і наступнага выбуху каля Інстытута раку загінула сама меней 17 чалавек, яшчэ 32 атрымалі раненні, паведамляе тэлеканал Al Arabiya са спасылкай на міністэрства аховы здароўя Егіпта.

ДТЗ адбылося ў выніку сутыкнення некалькіх машын, пасля чаго адбыўся выбух. Падрабязнасці інцыдэнту не ўдакладняюцца. Вядома, што нанесена шкода інфраструктуры Інстытута раку. Была праведзена эвакуацыя персаналу і пацыентаў медустановы.

Да месца здарэння была накіравана група следчых, якім даручана тэрмінова правесці расследаванне.

### ФБР асцерагаецца, што нядаўнія ўзброеныя напады ў ЗША могуць падштурхнуць экстрэмістаў да насілля

Федэральнае бюро расследаванняў ЗША выказала занепакоенасць тым, што масавыя расстрэлы людзей, падобныя да злачынстваў, што адбыліся ў мінулыя выхадныя ў Эль-Пасе (штат Тэхас) і Дэйтане (штат Агая), могуць падштурхнуць экстрэмістаў да новых актаў насілля.

«ФБР па-ранейшаму занепакоена тым, што ваяўнічыя экстрэмісты, якія знаходзяцца ў ЗША, могуць натхніцца гэтымі і папярэднімі гучнымі нападзеннямі на тое, каб



удзельнічаць у аналагічных актах насілля», — адзначаецца ў паведамленні. Ведамства заклікала грамадзян ЗША паведамляць у праваахоўныя органы аб любых падазроных дзеяннях (у тым ліку ў інтэрнэце).

Бюро таксама паведаміла, што прымае актыўны ўдзел і аказвае дапамогу ў расследаванні апошніх трагічных здарэнняў. У заяве прыводзіцца выказванне дырэктара ФБР Крыстафера Рэя, які выказаў спачуванні сем'ям загінулых і паведаміў, што знаходзіцца ў кантакце з прэзідэнтам ЗША Дональдам Трампам і кіраўніком мінюста Уільямам Бары. Ён адзначыў, што супрацоўнікі ведамства «задзейнічаюць усе рэсурсы ФБР», каб дабіцца здзяйснення правасуддзя.

### Індыя мае намер адмяніць асаблівы канстытуцыйны статус штата Джаму і Кашмір

Урад Індыі аб'явіў аб адмене артыкула 370 канстытуцыі, які надзяляе штат Джаму і Кашмір асаблівым статусам. Пра гэта паведаміў міністр унутраных спраў Індыі Аміт Шах, выступаючы ў парламенце краіны.

«Артыкул 370, які надзяляў Джаму і Кашмір асаблівым статусам, варта адмяніць. Уладкаванне Джаму і Кашміра павінна быць рэарганізавана», — сказаў міністр, выступленне якога транслявалі індыйскія тэлеканалы.

Пастанову, якая змяшчае адпаведную прапанову, падпісаў прэзідэнт Рам Натх Кавінд.

Большасць у ніжняй палаце парламента Індыі належыць кіруючай Індыйскай народнай партыі, што забяспечвае праходжанне рашэнняў урада праз гэты заканадаўчы орган.



Па канстытуцыі Індыі Джаму і Кашмір мае асаблівую аўтаномію, у гэтым штаце ўсе законы, прынятыя цэнтральным урадам (за выключэннем тых, што датычацца сфер абароны, знешніх сувязяў і некаторых іншых), павінны праходзіць адабрэнне мясцовай асамблеі. Жыхары іншых рэгіёнаў Індыі не маюць права купляць у Кашміры зямлю. Штат мае ўласны сцяг са статусам нароўні з дзяржаўным. Ёсць і іншыя прывілеі.

Згодна з прапановай урада, Джаму і Кашмір страчвае статус штата і робіцца саюзнай тэрыторыяй (якая мае менш правоў, чым штат).

# Ураджай на поўначы павялічыцца

## А пасяўныя плошчы вырастуць

**2019 год увойдзе ў гісторыю жніва тым, што ў самай паўночнай вобласці краіны — Віцебскай — раней, чым у параўнальна больш цёплых рэгіёнах Беларусі, шанавалі камбайнера-двухтысячніка. Герой барацьбы за ўраджай — Сяргей Зелянкевіч з гаспадаркі «Бярозавы край» Браслаўскага раёна. Між іншым, менавіта тут сёлета арганізуюць абласное свята працаўнікоў вёскі «Дажынкі».**



Перадавіка павіншаваў і **старшыня аблвыканкама Мікалай ШАРСНЁЎ.** Кіраўнік мясцовай улады адзначыў, што дзякуючы змяненню клімату поўнач ужо можа даць фору іншым абласцям краіны падчас жніва. І падзяліўся спадзяваннямі наконт таго, каб надвор'е не перашкодзіла сабраць, магчыма, рэкордны ўраджай збожжа.

У 2020 годзе ён адназначна стане яшчэ большы, бо губернатар Віцебшчыны даручыў ужо восенню давесці агульную плошчу азімага збожжа да ўзроўню 300 тысяч гектараў.

Для параўнання: паводле інфармацыі камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Віцебскага аблвыканкама, у гэтую сяўбу плошча азімых складае 200 тысяч гектараў. А ўсяго збожжавых і зернебабовых культур — 354 тысячы гектараў.

Для збору збожжа і рапсу плануецца выкарыстаць каля 1,4 тысячы камбайнаў. Неабходнасць у механізатарах для правядзення ўсіх відаў работ — каля 6,1 тысячы, у тым ліку тых, хто працуе на камбайнах, — 1715 чалавек.

У сельскагаспадарчых арганізацыях у штаце 5165 механізатараў. Недахоп — каля 935. Але традыцыйна часова на палях у жніво працуюць студэнты, навучэнцы, практыканты, работнікі, якіх прыцягваюць з іншых пасад гаспадарак, а таксама з іншых арганізацый.

Калі надвор'е не будзе вельмі капрызнае, сабраць ураджай збожжавых можна будзе за 25 дзён.

Як агучыў на пасяджэнні аблвыканкама **начальнік Віцебскага абласнога ўпраўлення МНС Сяргей МЯЛЕШКІН**, асаблівую трывогу выклікаюць пажары на аб'ектах, звязаных з нарыхтоўкай кармоў і ўборкай ураджаю. Ён падкрэсліў, што адна справа вырасціць і сабраць ураджай, нарыхтаваць кармавую базу, але яго трэба яшчэ і захаваць. І пры гэтым не дапусціць знішчэння сельскагаспадарчай тэхнікі, якая выкарыстоўваецца пры нарыхтоўцы кармоў і ўборцы ўраджаю.

Дарэчы, статыстыка за апошнія пяць гадоў дастаткова цікавая. Пачынаючы з 2014 года, зарэгістравана 44 пажары сельскагаспадарчай тэхнікі. У выніку 27 адзінак знішчана, 17 патрабавала аднаўлення. Прамая шкода (без уліку вытворчых прастояў і выдаткаў на аднаўленне) — больш за 500 тысяч рублёў.

За пяць гадоў было дзевяць пажараў на зернесушыльных комплексах. У тым ліку ўжо два пажары адбыліся сёлета.

Падчас рэйдаў супрацоўнікі МНС прапанавалі ажыццявіць каля 790 прафілактычных мерапрыемстваў. Прыкладна палова з таго, што неабходна было зрабіць, не выканана.

Губернатар патрабаваў не проста прыслухацца да прынцыповай крытыкі, а зрабіць усё, каб не было надзвычайных здарэнняў. Насамрэч трэба ўлічваць усе нюансы, каб не згарэла «золата палёў», аб'екты яго сушкі, захавання, тэхніка... Тым больш — каб не пацярпелі людзі. Пакуль што выратавальнікі абмяжоўваюцца прадпісаннямі, але на тых, да каго, як кажуць, не даходзіць, абавязкова знойдуцца меры адэкватнага пакарання. Дысцыпліны ва ўсім і прытрымлівання тэхналогій, нагадаю, патрабаваў кіраўнік краіны, калі абмяркоўвалася пытанне жніва.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**




# Больш за чатыры з паловай мільёны тон збожжа

## намалацілі беларускія аграрыі па стане на раніцу панядзелка

**Пра гэта паведамілі ў Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання.**

Збожжавыя і зернебабовыя культуры (акрамя проса, грэчкі і кукурузы) былі сабраны больш чым на 1,4 мільёна гектараў. Гэта амаль 2/3 ад агульнай плошчы пасеваў. Адзнаку ў 1 мільён тон збожжа пераадолелі на Міншчыне і Брэстчыне. Там ужо апрацавана 63,7 і 91,5 % пасяўных плошчаў адпаведна.

Найлепшая ўраджайнасць у краіне — у Гродзенскай вобласці. Там збіраюць 38,4 цэнтнера з аднаго гектара. Гэта нашмат вышэй за леташнія 30. Праўда, агульная лічба намалоту за выхадныя да мільёна тон не дацягнула, спыніўшыся на 948 тысячах. Зрэшты, там убрана пакуль 75,9 % плошчаў.

А вось самая нізкая ўраджайнасць сёлета ў Гомельскай вобласці. Там з аднаго гектара ўбіраюць толькі 22,7 цэнтнера збожжа. Агульны каравай складае 479 тысяч тон. Засталося ж убраць на Гомельшчыне 36,4 % плошчаў.

У Магілёўскай вобласці сабралі пакуль што 488 тысяч тон пры сярэдняй ураджайнасці 25,8 цэнтнера з гектара. Пакуль што пройдзена 60,4 % плошчаў. Замыкае рэйтынг па традыцыі Віцебшчына. У самым паўночным рэгіёне ўжо ўбрана 41,8 % плошчаў і намалочана крыху больш за 460 тысяч тон збожжа.

Дзяржаўная замова на пастаўкі збожжа складае 815 тысяч тон. Па стане на 5 жніўня выканана больш за палову плана.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Трэба ведаць!

# Змяніліся нормы расходаў на харчаванне ў садках і школах

**Пастановай Савета Міністраў № 504 ад 31 ліпеня 2019 года павялічваюцца нормы расходаў на харчаванне асобных катэгорый навучэнцаў ва ўстановах адукацыі. Дакумент апублікаваны на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале.**



У прыватнасці, на харчаванне ў яслях, яслях-садках, дзіцячых садках, дашкольных цэнтрах развіцця дзіцяці, спецыяльных яслях-садках і дзіцячых садках, вучэбна-педагагічных комплексах грашовыя нормы расходаў выраслі на 10 %. Таксама ў сярэднім на 10 % яны павялічаны для школьнікаў, гімназістаў, ліцэістаў і некаторых іншых катэгорый навучэнцаў.

На 7—10 % выраслі нормы расходаў на харчаванне ў цэнтрах карэкцыйна-развівальнага навучання і рэабілітацыі з працягласцю знаходжання 6—8 гадзін (двухразовае харчаванне), 9—10,5 гадзіны (трохразовае харчаванне), 12—24 гадзіны (чатырохразовае). Акрамя таго, на 10 % павялічаны нормы ў санаторных яслях-садах і дзіцячых садках, санаторных групах Рэспубліканскага цэнтра для дзяцей дашкольнага ўзросту з парушэннем слыху.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Падзея

# Экзамен для прафесійнай школы

**На 45-м міжнародным чэмпіянаце WorldSkills, які пройдзе з 22 па 27 жніўня ў Казані (Расія), беларуская каманда выступіць у 33 кампетэнцыях.**

— Нашы ўдзельнікі прадэманструюць свае навыкі ў такіх кірунках, як тэхналогіі будаўніцтва, вытворчыя і інжынерныя тэхналогіі, інфармацыйныя і камунікацыйныя тэхналогіі, транспарт і лагістыка, сацыяльныя і персанальныя паслугі, творчыя прафесіі і мода, а таксама ў трох новых кампетэнцыях кірунку Future Skills (прафесіі будучыні), — расказаў журналістам **рэктар Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі Валерый ГАЛУБОЎСКІ.** — Таксама мы будзем прадстаўлены і на чэмпіянаце юніёраў WorldSkills Junior. Агульны склад каманды, уключаючы ўдзельнікаў, экспертаў, перакладчыкаў, афіцыйных асоб, — 83 чалавекі.

Спаборніцтвы сярод маладых прафесіяналаў пройдуць у 56 конкурсных кампетэнцыях. На сённяшні дзень у міжнародным некамерцыйным руху WorldSkills International удзельнічаюць 79 краін, на тэрыторыі якіх пражывае 70 % насельніцтва зямнога шара. У Казані свае нацыянальныя зборныя выставіць 63 краіны, усяго плануецца 1,5 тысячы ўдзельнікаў. Да падзеі прыцягнуты 2 тысячы экспертаў і больш за 2,5 тысячы валанцёраў. Дзелавая праграма чэмпіянату абяцае быць вельмі насычанай: у яго рамках пройдзе саміт міністраў адукацыі краін — удзельніц руху WorldSkills International, міжнародная канферэнцыя «Навыкі для перамен», выстаўка WorldSkills Kazan 2019.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Надвор'е

# АД СЕРАДЫ — ДАЖДЖЫ

**На гэтым тыдні ў Беларусь вернецца цяпло. Аднак не без «але». Ужо сёння да нас з Заходняй Еўропы пойдуць вільготныя паветраныя масы. Падрабязней пра гэта расказалі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**



Сёння ў нашай краіне захаваецца панаванне вобласці павышанага атмасфернага ціску. Але ўдзень з Польшчы да нас прыйдзе атмасферны фронт. Таму кароткачасовыя дажджы чакаюцца толькі па захадзе. Месцамі прагрымяць навальніцы. Што да тэмпературы паветра, то будуць цалкам камфортныя 19—26 градусаў вышэй за нуль.

А вось з серады надвор'е пачне змяняцца. Кароткачасовыя навальнічныя дажджы распаўсюдзяцца ўжо на большую частку тэрыторыі краіны. Уначы чакаецца 11—17 цяпла. Удзень жа, як і ў аўторак, паветра прагрэецца максімум да 26 градусаў. Паўднёвы вецер зменіцца на ўмераны заходні, які пры навальніцах будзе парывісты.

У чацвер жа «за бортам» чакаецца зусім некамфортная абстаноўка. Да нас будуць змяшчацца актыўныя атмасферныя франты з паўднёвага захаду Еўропы. Кароткачасовыя дажджы пройдуць зноў жа на большай частцы тэрыторыі. Раніцай і ўдзень яны месцамі стануць моцныя. Вецер чакаецца паўднёва-заходні з пераходам на заходні і паўночна-заходні, парывісты, месцамі моцны. Але холадна не будзе. Уначы чакаецца ад 12 да 19 градусаў цяпла, удзень — ад 18 да 25.

Па папярэдніх прагнозах, да канца тыдня сінаптычная абстаноўка палепшыцца.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# Лечаць ствалавымі клеткамі, друкуюць каронкі і масты

## ЗУБЫ З БУДУЧЫНІ

Ствалавыя клеткі — ужо не ўяўная будучыня і ў стаматалогіі. На сёння ў Беларусі з іх дапамогай вылечылі тры дзясяткі пацыентаў, якія мелі рэцэсію (апусканне) дзясны. Хваробы перыядонта (запаленне тканак, якія акружаюць зуб) цяпер трывала занялі другое месца пасля карыесу. Калі на апошні пакутуе амаль кожны (98—99 % насельніцтва), то з хваробамі перыядонта сутыкаецца каля 94 % людзей ва ўзросце 34—44 гадоў. Каля 20 % пацыентаў маюць цяжкія формы захворвання, калі патрабуецца нават выдаленне зуба.

Сумесна з Інстытутам біяфізікі і клетачнай інжынерыі Нацыянальнай акадэміі навук беларускія стаматолагі распрацавалі тэхналогію клетачных трансплантацый у стаматалогіі. Яна якраз і выкарыстоўваецца для лячэння хвароб перыядонта, у прыватнасці з апусканнем дзясны. З падуздышнай вобласці ў пацыента ў шпрыц набіраюць 10—12 мілілітраў тлушчавай тканкі. Затым у лабараторыі на працягу 21 дня з яе вылучаюць ствалавыя клеткі. А потым змешваюць іх з калагенавым гелем і ўводзяць пацыенту ў месцы, дзе «прасела» дзясна.

— Што такое рэцэсія? Гэта апусканне дзясны, змяншэнне яе аб'ёму. У некаторых пацыентаў узнікаюць так званыя чорныя трохкутнікі, і мы бачым гэтыя прамежкі паміж зубамі. У вобласць мяккіх тканак мы і ўводзім сумесь калагенавага гелю і ствалавых клетак, — тлумачыць **загадчык кафедры артапедычнай стаматалогіі і артадантыі з курсам дзіцячай стаматалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, доктар медыцынскіх навук, прафесар Сяргей РУБНІКОВІЧ.**



На сёння гэту методыку апрабавалі больш чым на 30 пацыентах. Лячэнне правялі ў межах навуковага праекта, сродкі на які вылучыла дзяржава. Цяпер выбрана 5-7 пацыентаў, якія маюць паказанні да такой аперацыі, праўда, далей гэтыя ўмяшанні будуць праводзіцца на платнай аснове. Пакуль такі курс лячэння каштуе 600—800 рублёў, але калі маніпуляцыя стане масавай, з'явіцца магчымасць знізіць яе цану. За мяжой, дарэчы, таксама выкарыстоўваюцца падобныя тэхналогіі, праўда, усе яны адрозніваюцца варыянтамі стварэння біяінжынернай канструкцыі, а таксама коштам. У Расіі цана такога лячэння пачынаецца ад 1,5-2 тысяч долараў.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Лячэнне ствалавымі клеткамі — гэта не «тэрапія адчаю». Сёння ёсць і іншыя, у прыватнасці хірургічныя, метады лячэння па павелічэнні аб'ёму мяккіх тканак. Але яны не заўсёды эфектыўныя. Прымяненне ствалавых клетак менш траўматычнае для пацыента, эфект хутчэйшы, а вынік больш эстэтычны, — дадае **галоўны ўрач Рэспубліканскай клінічнай стаматалагічнай паліклінікі Андрэй МАТВЕЕЎ.**



Калі пры хірургічным лячэнні праз нейкі час могуць здарацца рэцыдывы, то новая тэхналогія падчас клінічных выпрабаванняў паказала станоўчую дынаміку на працягу двух-трох гадоў. Калі праз пяць-сем гадоў методыка лячэння ствалавымі клеткамі станоўча сябе зарэкамендуе, яна будзе ўкаранёна ў кожнай стаматалагічнай установе краіны.

Сяргей Рубніковіч падкрэсліў, што гэта не адзіны навуковы праект, які рэалізуецца беларускімі стаматолагамі разам з навукоўцамі. Распрацоўваюцца методыкі лячэння хвароб перыядонта сярэдняй і цяжкай формаў.

**За мяжой ёсць устаноўка на імплантацыю, каб пазбегнуць складанага лячэння. У Беларусі ж урачы да апошняга імкнуцца выратаваць зуб, што і прываблівае пацыентаў.**

— Праекты накіраваны на ўмацаванне коснай тканкі і павелічэнне яе аб'ёму. Цяпер вядуцца эксперыментальныя даследаванні, налета будуць праведзены клінічныя выпрабаванні, а праз паўтара-два гады, мяркую, мы запатэнтуем і гэтыя методыкі.

Беларускімі распрацоўкамі зацікавіліся і замежныя спецыялісты, у прыватнасці медыкі з Італіі і Кітая. А ў Расіі некаторыя беларускія методыкі ўзялі на ўзбраенне ў Кубанскім, Стаўрапольскім і Маскоўскім медыцынскіх універсітэтах.

— Мы вядзём распрацоўкі па нарошчванні мяккіх і цвёрдых тканак. А вось вырасціць такім спосабам зуб у свеце пакуль яшчэ не ўдалося нікому, — кажа Сяргей Рубніковіч.

## ХАДЗІЦЕ ДА ЎРАЧА

Сярод найноўшых тэхналогій і 3D-пратэзаванне.

— Тэхналогія дазваляе візуальна змадэляваць канструкцыю: каронку, мастападобны пратэз. Потым, выкарыстоўваючы спецыяльны станок, яе выфрэзероўваюць. А ўрачу застаецца толькі яе ўстанавіць, — расказвае Сяргей Рубніковіч.

**Летась замежнікі заплацілі за паслугі беларускіх стаматолагаў каля 1,3 мільёна долараў. Прычым самі беларусы патрацілі на гэтыя мэты 74 мільёны рублёў.**

Сумесна з Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэтам распрацаваны апарат, так званая 3D-шруба, якую выкарыстоўваюць для лячэння пацыентаў з храпам і сіндромам абструктыўнага апноэ — спыненнем дыхання падчас сну, якое доўжыцца ад дзесяці секундаў да дзвюх хвілін, ад чаго чалавек можа памерці. Такая шруба дазваляе правільна змадэляваць становішча ніжняй сківіцы падчас сну.

Спецыялісты падкрэсліваюць, што апошнім часам назіраецца рост раку сківічна-тваравай вобласці, галавы і шыі. У структуры анкалагічных захворванняў ён займае 5—10 %. Гэта новаўтварэнні поласці рота, паднябенных дужак, языка, сківічнай косткі.

— Насельніцтва старэе, паляпшаецца выяўляльнасць, таму мы назіраем рост, — тлумачыць Андрэй Матвееў. — Запушчаныя выпадкі, як правіла, — праблема пацыентаў, якія не з'яўляюцца да стаматолага на штогадовы прафілактычны агляд. Чалавек 3-4 гады не ходзіць да ўрача, і ў роце — 3-4-я стадыя раку: усё разбурана.

## БЯСШКОДНЫ ФТОР

Негатыўна ўплываюць на здароўе поласці рота курэнне, ужыванне алкаголю, а таксама незахаванне гігіены.

— Кантраляваная чыстка зубоў у дзяцей вядзе да зніжэння карыесу на 30 % у 12—14-гадовым узросце, — кажа Андрэй Матвееў. — Дастаткова навучыць правільна чысціць зубы (а гэта вымятаючыя вертыкальныя рухі — «ад чырвонага да белага») і не будзе карыесу. У дзіцячых калектывах мэтазгодна выкарыстоўваць фтарыраваную соль. У Швейцарыі, напрыклад, фтарыруюць малако, але гэта вельмі дарагая тэхналогія, фтарыраванне солі нашмат таннейшае. Наша насельніцтва добра ведае пра карысць ёдаванай солі, а вось фтарыраванай — не ведае.

Эксперт адзначае, што некалькі гадоў таму ў СМІ было шмат негатыўнай інфармацыі пра фтор, і падкрэсліў: выкарыстанне фтарыраваных зубных паст не нясе шкоды. Пры гэтым пасту трэба мяняць прыкладна раз на паўгода, бо да яе таксама адбываецца прывыканне. А зубы варта чысціць не менш за 2-3 хвіліны — «пакуль іграе ваша любімая мелодыя».

## ВІНІРЫ: СТАВІЦЬ ЦІ НЕ

— На кожны від пратэзавання маюцца свае паказанні і супрацьпаказанні. Калі стаматолаг бярэцца ставіць вам вініры (фарфоравыя ці кампазітныя пласцінкі, якія мяняюць знешні выгляд зуба. — **Аўт.**), значыць, ён бярэ на сябе адказнасць за вынік. Пры ўстаноўцы вініраў цвёрдая тканка зуба сашліфоўваецца. Раней таўшчыня вініраў была 1-2 міліметра, і такая таўшчыня тканкі зуба знімалася, цяпер іх таўшчыня ўсяго 0,3-0,4 міліметра, — расказвае Андрэй Матвееў.

Дарэчы, многія кліенты жадаюць мець «вялікія і белыя» зубы. Праўда, асляпляльная белізна, або колер «сантэхнічнай керамікі», ужо не ў трэндзе, хоць працэдуры адбельвання дагэтуль актуальныя. Варта памятаць, што такі стан патрабуецца пастаянна падтрымліваць — з перыядычнасцю раз на год.

## ТАННЕЙ, ЧЫМ ЗА МЯЖОЙ

Не сакрэт, што лячэнне і пратэзаванне ў нашай краіне абыходзяцца нашмат танней, чым за мяжой. Чым і карыстаюцца як суседзі, так і жыхары далёкіх краін, нават такіх як Уругвай, Бразілія, ЗША, Ізраіль. Летась беларускія стаматолагі прынялі 11,8 тысячы замежнікаў (на 0,6 тысячы больш, чым у 2017-м)

— На першым месцы, канешне, расіяне. Далей грамадзяне Украіны, Польшчы, Літвы, краін Еўропы і Ізраіля. Як правіла, гэта нашы былыя суайчыннікі, якія прыязджаюць у госці да сваякоў і займаюцца лячэннем і пратэзаваннем. Пратэзаванне, асабліва складанае, у нас значна таннейшае, чым за мяжой, — тлумачыць Андрэй Матвееў.

Летась замежнікі заплацілі за паслугі беларускіх стаматолагаў каля 1,3 мільёна долараў. Прычым самі беларусы патрацілі на гэтыя мэты 74 мільёны рублёў. Як падкрэсліў эксперт, за мяжой ёсць устаноўка на імплантацыю, каб пазбегнуць складанага лячэння. У Беларусі ж урачы да апошняга імкнуцца выратаваць зуб, што і прываблівае пацыентаў. На другім па запатрабаванасці месцы пасля лячэння — пратэзаванне, на трэцім — лячэнне хвароб перыядонта, карыстаецца папулярнасцю і адбельванне.

Дарэчы, сярэдняя зарплата ўрача-стаматолага ў паліклініцы — 1200 рублёў. Артапед атрымлівае да 1500 рублёў. Па словах галоўнага ўрача, многія беларускія стаматолагі, папрацаваўшы за мяжой, дзе стаматалогія ператворана ў бізнес, вяртаюцца на радзіму, дзе падыходы да лячэння зусім іншыя.

**Алена КРАВЕЦ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**



**Маладыя спецыялісты праходзяць у рэспубліканскай паліклініцы інтэрнатуру, а пасля застаюцца працаваць.**

---

Ведай нашых!

# «Нахімічылі» на «серабро»

**Два сярэбраныя і два бронзавыя медалі заваявалі на 51-й Міжнароднай хімічнай алімпіядзе ў Парыжы беларускія школьнікі.**

Сярэбранымі прызёрамі сталі **Яўген Маліч** (Ліцэй БДУ) і **Максім Сысоенкаў** (сталічная гімназія № 50). Бронзавыя медалі — у **Алега Караткова** (Ліцэй БДУ) і **Івана Мамчыца** (гімназія № 10 Маладзечна). Усе хлопцы скончылі школу ў бягучым годзе і з'яўляюцца пераможцамі заключнага этапу Рэспубліканскай алімпіяды па хіміі.

Кіраўнікамі беларускай каманды выступілі супрацоўнікі хімічнага факультэта БДУ загадчык кафедры агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі **Віктар Хвалюк** і старшы выкладчык кафедры арганічнай хіміі **Дзяніс Шклярук.**

Усяго ў 51-й Міжнароднай хімічнай алімпіядзе прынялі ўдзел 270 навучэнцаў з 80 краін. Спаборніцтвы традыцыйна складаюцца з двух тураў — тэарэтычнага і практычнага. Абодва доўжацца каля пяці гадзін і праводзяцца ў розныя дні.

Упершыню Міжнародную хімічную алімпіяду правялі ў 1968 годзе ў Празе (Чэхія). Яна накіраваная на папулярызацыю хімічнай навукі і павышэнне цікавасці да яе з боку школьнікаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

СОЮЗ ЕВРАЗИЯ

№ 14 (122) Вторник, 6 августа 2019 года Для читателей Беларуси, России, Казахстана, Армении, Кыргызстана

Выходит 2 раза в месяц Издается с 26 апреля 2014 года

# ОТ «АТОМКИ» ДО АНАПЫ

## Где «засветились» бойцы студенческих отрядов Беларуси и России



Фото БелТА.

**В основном это белорусская стройка века — атомная станция в Островце. Сюда отряды двух стран приезжают уже на протяжении шести лет, с тех пор как между БРСМ и Молодежной организацией «Российские студенческие отряды» подписано специальное соглашение. Среди бойцов стройотрядов немало будущих атомщиков. В этом году российский десант высадился в Островце в количестве 65 человек.**

Отряд получился сводным и объединил 250 белорусских и российских студентов. Обе страны представлены самыми разными вузами. Впрочем, так происходит каждый год, когда на Всебелорусскую стройку в первой декаде июля приезжают российские и белорусские студотрядовцы. Все отряды, каждый из которых имеет свое название, перед началом трудового семестра в торжественной обстановке получили путевки.

Конечно, главным объектом, где трудятся студенты, можно считать саму атомную станцию. Но не только. Ребята работают на возведении социально значимых объектов. Уже в августе в Островце будут сданы детский сад на 230 мест, школа на 765 мест и дом детского творчества. Студенты как раз и поставят точку в благоустройстве этих объектов. Ребята выполняют геодезические, земляные, бетонные, отделочные, арматурные, малярные работы, укладывают тротуарную плитку. Зарплаты до 600 рублей.

Стройка хоть и престижная, но далеко не простая. Сюда брошены, что называется, лучшие силы. А поэтому и отбор проходил довольно жесткий, причем на конкурсной основе. Основные требования касались возраста (не младше 18 лет), здоровья и наличия строительной специальности не ниже второго-третьего разряда. В общей сложности «счастливчики» выдержали конкурс в три человека на место. Вполне возможно, что это лето для сводного студенческого отряда на данном объекте последнее, ведь здесь останутся работы в основном для узких специалистов. Для некоторых, как оказалось, стройка стала и основным местом работы после студотрядов: они вернулись сюда уже мастерами, прорабами и инженерами. По плану первый энергоблок станции будет введен в эксплуатацию в конце этого года, второй — в 2020 году.

Для российских студентов работа в стройотряде — это еще и возможность лучше узнать Беларусь. Вместе со своими белорусскими коллегами они совершают поездки по историческим местам, знакомятся с культурой и архитектурой страны и вообще находят время для активного отдыха. Здесь не редкость спортивные турниры, интеллектуальные квесты, конкурсы, в частности, на лучший отряд и даже на лучшую принимающую сторону. На стройке работает большое число подрядных организаций, с пятью из них студотряды заключили трудовые договоры — это как белорусские, так и российские предприятия.

Если российские студенты едут совершенствовать себя в основном на белорусскую «атомку», то гродненцы протопили дорожку на черноморское побережье России.

Сервисные и педагогические отряды ГрГУ имени Янки Купалы набираются опыта в российском оздоровительном лагере на побережье Черного моря в Анапе. И название у белорусского отряда подходящее — «Дети Нёмана». Надо сказать, что отряд, который создан четыре года назад, отлично себя показал и не раз получал благодарности от ЦК БРСМ как лучший отряд, работающий за рубежом.

Попасть в него тоже не так просто. Это лучшие студенты факультета. Все они проходят курсы вожатского мастерства, изучают основы охраны труда и трудового права и даже сдают экзамены. Всего в российском городе в качестве вожатых, официантов и спасателей в составе студотряда работают 100 гродненских студентов. Отдых тоже проводят с пользой — ездят на экскурсии по Краснодарскому краю, плавают в море, гуляют по городу. Трудовой семестр бойцов студенческих отрядов продлится до конца августа.

**Маргарита УШКЕВИЧ.**

## НОВОСТИ СОЮЗА

### КВОТЫ НА ИМПОРТ

Коллегия Евразийской экономической комиссии установила на 2020 год тарифные квоты на отдельные виды сельскохозяйственных товаров, ввозимых в ЕАЭС, а также объемы тарифных квот на них. Об этом сообщается на сайте ЕЭК.

Так, для Беларуси на будущий год допустимы квоты в следующих объемах: свинина — 20 тысяч тонн, обваленное мясо домашних кур — 10 тысяч тонн, обваленное мясо индеек — 0,9 тысячи тонн.

Для Казахстана квота на мясо крупного рогатого скота устанавливается в объеме 21 тысячи тонн, мясо птицы — 140 тысяч тонн. Для Кыргызстана квота на мясо крупного рогатого скота составит 5 тысяч тонн, свинину — 3,5 тысячи тонн, мясо птицы — 58 тысяч тонн.

Для России предусмотрена квота на мясо крупного рогатого скота в объеме 570 тысяч тонн, мясо птицы — 364 тысячи тонн, молочной сыворотки — 15 тысяч тонн.

Армения проинформировала об отсутствии необходимости установления на 2020 год тарифных квот.

Одновременно решением Коллегии ЕЭК предусмотрено, что государства-члены распределят объемы тарифных квот между участниками внешнеторговой деятельности в соответствии с национальным законодательством. Их уполномоченные органы будут выдавать лицензии на импорт продукции в рамках установленных тарифных квот. Россия будет распределять объемы тарифных квот между третьими странами в соответствии с национальным законодательством и ее обязательствами в рамках ВТО.

В пределах установленных тарифных квот допускается ввоз сельскохозяйственной продукции из третьих стран по более низким ставкам ввозных таможенных пошлин по сравнению со ставками Единого таможенного тарифа.

### ВЫХОД НА ОБЩИЙ РЫНОК

25 сентября в рамках IV Международного выставочного форума «Евразийская неделя» (Бишкек) пройдет круглый стол «Общие рынки энергетических ресурсов Евразийского экономического союза: фактор повышения энергобезопасности и новые возможности для бизнеса» под председательством **члена Коллегии (министра) по энергетике и инфраструктуре Евразийской экономической комиссии Эмиля КАЙКИЕВА**. Об этом сообщает пресс-служба ЕЭК.

«Формирование общего электроэнергетического рынка ЕАЭС является одним из важных факторов развития интеграционных процессов на евразийском экономическом пространстве. Хочу отметить, что создание рынка направлено, прежде всего, на переход к рыночным, в том числе биржевым, механизмам ценообразования, а также обеспечение добросовестной конкуренции», — подчеркивает Эмиль Кайкиев.

На круглом столе участники обсудят создание общих рынков энергетических ресурсов (электроэнергии, газа, нефти и нефтепродуктов), состояние и перспективы топливно-энергетических комплексов ЕАЭС в области энергобезопасности и энергоэффективности, а также значение бизнеса в создании общих рынков энергоресурсов Союза.

Напомним, что в мае этого года в рамках заседания Высшего Евразийского экономического совета главы государств подписали международный договор о формировании общего электроэнергетического рынка ЕАЭС.

**Ольга МЕДВЕДЕВА.**

# «ВЫ ПРЕДУПРЕЖДЕНЫ!»

**Институт предупреждения нарушений конкуренции в ЕАЭС может быть внедрен в скором времени. Об этом сообщила журналистам директор Департамента конкурентной политики и политики в области государственных закупок Евразийской экономической комиссии Алия Джумабаева перед началом заседания общественной приемной блока по конкуренции и антимонопольному регулированию Евразийской экономической комиссии, которая прошла в конце июля в Минске.**



Отвечая на вопрос о совершенствовании законодательства в области конкуренции на территории Евразийского экономического союза, Алия Джумабаева отметила, что этот процесс идет постоянно.

«Мы понимаем, что по мере углубления интеграции возникает множество вопросов. Рынки развиваются, и ситуация не стоит на месте. Это естественный процесс, когда требуется совершенствование законодательства, — сказала представитель ЕЭК. — На подходе у нас создание института предупреждений. Это превентивная мера, которая позволяет предотвратить и устранить признаки нарушения конкуренции, не доказывая, что они уже есть, то есть без сбора доказательств. Если мы видим явные признаки, выносим субъекту предупреждение о том, что подобные действия недопустимы, и предлагаем ему самостоятельно их устранить. Если этого не будет сделано, возбуждается расследование. Если во время этого расследования будет собрана вся доказательная база, то субъект будет привлечен к ответственности. А это штрафы (достаточно существенные), имиджевые риски».

По словам Алии Джумабаевой, сегодня довольно остро стоит вопрос по третьим странам, поскольку в настоящее время у ЕЭК нет инструментов привлечения к ответственности субъектов зарубежных организаций. «Кроме того, сейчас у нас рассматривается вопрос смягчения ответственности и освобождения от ответственности, — отметила директор департамента. — Евразийская экономическая комиссия заказала научно-исследовательскую работу. В августе мы хотим провести по ней публичные слушания. Я думаю, что бизнес это тоже заинтересует».

ЕЭК выступает с инициативой скорректировать процедуру подачи заявлений о возможных признаках недобросовестной конкуренции. Сегодня эта процедура предусматривает, что если подан неполный пакет документов, то они возвращаются заявителю. «Сейчас мы вносим изменения в право Союза. Мы хотим дать возможность субъектам без возврата документов их донести. Это очень существенный момент», — отметила Алия Джумабаева. Прорабатывается и вопрос о возможности подачи заявления в электронном формате.

Алия Джумабаева отметила, что заседания Общественной приемной, которые проводит Евразийская экономическая комиссия по вопросам конкуренции и антимонопольного регулирования в странах Евразийского экономического союза, востребованы бизнес-сообществом.

Представители более 40 крупнейших промышленных и сельскохозяйственных предприятий-экспортеров, концернов, ассоциаций и бизнес-союзов Беларуси, принявшие участие в мероприятии, получили «из первых рук» полную информацию о союзном законодательстве в этой сфере, включая последние изменения в нормативно-правовых актах ЕАЭС по защите конкуренции.

«Для Комиссии наказание хозяйствующих субъектов не является основной целью. Гораздо важнее предотвратить нарушение, не допустить создания условий для его возникновения на трансграничных рынках. Именно на это направлено включение в Договор о ЕАЭС инструментов «мягкого права» — предупреждений и предостережений»,— подчеркнула Алия Джумабаева.

В 2018 году в Комиссию по линии общественных приемных поступило 27 заявлений, было проведено 9 расследований и рассмотрено 5 дел. Как говорят эксперты, самое распространенное нарушение — недобросовестная конкуренция, на втором месте — злоупотребление доминирующим положением, на третьем — антиконкурентные соглашения.

**Ольга МЕДВЕДЕВА**.

# Польза была уже на второй год

## В 2016 году отрицательную динамику ВВП стран — участниц ЕАЭС удалось изменить на положительную за счет согласованной структурной политики в промышленности

**И это несмотря на различия в темпах экономического роста, в структуре национальных экономик и уровне социально-экономического развития стран — участниц ЕАЭС. Если «пятерка» сумеет выработать согласованную промышленную политику, она ощутимо усилит свои позиции в мировой экономике.**

